Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________ В. М. Міхееў
«____»_____________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПІРАТЭХНІКА Ў СВЯЦЕ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*П. А. Гуд,* загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*У. А. Мішчанчук,* дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», прафесар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;

*А. Г. Фядотаў,* дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 28.10. 2011 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24.05.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *П. А. Гуд*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На сучасным этапе перад дзеячамі культуры востра паўстала праблема стварэння новай святочнай культуры, пабудаванай перш за ўсё на аснове мастацкіх традыцый беларускага народа.

Адным з яскравейшых фрагментаў беларускіх свят мінулых часоў былі разнастайныя піратэхнічныя дзеі і феерверкі, якія з'яўляліся кульмінацыйным момантам або фіналам святочнай дзеі. Этнаграфічныя і літаратурныя матэрыялы пераканаўча даказваюць, што феерверкі (рознакаляровыя дэкаратыўныя агні) на тэрыторыі Беларусі маюць багатыя мастацкія традыцыі. Таму вывучэнне, асэнсаванне і развіццё мастацкай спадчыны мае практычную неабходнасць, з'яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

Вучэбная дысцыпліна «Піратэхніка ў свяце» прадугледжвае выкладанне творчых, матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і фінансавых аспектаў увасаблення асобных піратэхнічных дзей і феерверкаў з улікам тэарэтычных дасягненняў айчыннай і замежнай рэжысуры, этналогіі, фалькларыстыкі, мастацтвазнаўства пры выкарыстанні значнага навукова-метадычнага матэрыялу: манаграфій, навукова-папулярных прац, метадычных дапаможнікаў і асобных публікацый па асобных праблемах арганізацыі свята. Засваенне дысцыпліны «Піратэхніка ў свяце» абапіраецца на веды, уменні і навыкі студэнтаў, атрыманыя пры вывучэнні дысцыплін «Гісторыя свят», «Традыцыйная святочная культура беларусаў, «Рэжысура свят», «Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята».

Выкладанне дысцыпліны дазваляе ў поўнай меры рэалізаваць міжпрадметныя сувязі, сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі, выпрацаваць у іх аб'ектыўныя падыходы і знайсці шляхі вырашэння тэхналагічных праблем увасаблення піратэхнічных дзей.

*Мэта* дысцыпліны – набыццё студэнтамі сістэмы ведаў, практычных навыкаў і ўменняў па розных аспектах стварэння і арганізацыі феерверкаў на аснове культурна-гістарычнай піратэхнічнай спадчыны.

*Задачы* дысцыпліны:

– знаёмства з гісторыяй развіцця феерверкаў у Беларусі;

– набыццё ведаў аб піратэхнічных вырабах, тэхналогіі вырабу піратэхнічных фігур і кампазіцый;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалоданне методыкай стварэння сцэнарыя феерверку, а таксама плана яго матэрыяльна-тэхнічнага і фінансавага забеспячэння;

– здзяйсненне сцэнарна-рэжысёрскай распрацоўкі піратэхнічных дзей дыпломнага свята студэнта;

– авалодванне практычнымі навыкамі арганізацыі піратэхнічных дзей.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Піратэхніка ў свяце» студэнт павінен *ведаць*:

– традыцыі і навацыі ўвасаблення феерверкаў розных часоў;

– функцыянальныя абавязкі арганізатараў піратэхнічных дзей;

– арганізацыйныя і вытворчыя аспекты архітэктурна-дэкаратыўнага афармлення феерверку;

– асноўныя этапы работы над увасабленнем феерверку;

– асноўныя напрамкі фінансавання разнастайных піратэхнічных дзей;

– арганізацыю работ дапаможных службаў свята ў час падрыхтоўкі і ўвасаблення феерверкаў і асобных піратэхнічных дзей;

*умець:*

– ажыццявіць сцэнарна-рэжысёркую распрацоўку феерверку і арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя;

– вызначыць заданні галоўнаму мастаку свята па распрацоўцы эскізаў і вырабе мастацка-дэкаратыўнага афармлення піратэхнічных дзей (канструкцый пірафігур, мастацкіх кампазіцый, касцюмаў для ўдзельнікаў пластычных груп і г.д.); гукарэжысёру – па ўвасабленні гукавога афармлення феерверку, запісе і мантажы фанаграм;

– распрацаваць службовую дакументацыю феерверку;

– выявіць кірункі фінансавання піратэхнічных дзей;

– праводзіць кантроль выканання ўсіх відаў работ, звязаных з падрыхтоўкай і ўвасабленнем феерверку;

– арганізаваць рэпетыцыйны працэс;

– увасобіць святочны феерверк і наладзіць работу яго дапаможных службаў;

– карыстацца метадычнай і даведачнай літаратурай па пытаннях тэхналогіі арганізацыі феерверку.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, апрача аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваюцца наведванне студэнтамі дэманстрацый феерверкаў, прагляд і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналіз відэаматэрыялаў з запісамі падрыхтоўкі і правядзення рознага віду піратэхнічных дзей. Сярод актыўных тэхналогій работы са студэнтамі неабходна вылучыць:

– дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый, аналіз сітуацый з практыкі і інш.);

– сенсітыўны трэнінг (трэніроўка самапазнання, рэгуляванне эмацыянальных адносін да сябе і калег);

– гульнявыя метады (імітацыйныя, дзелавыя, ролевыя гульні, «генерацыя ідэй» і інш.);

– візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаметад).

Дысцыпліна «Піратэхніка ў свяце» мае тэарэтычную і практычную накіраванасць, прадугледжвае вывучэнне спецыфікі розных методык увасаблення феерверку.

У адпаведнасці з вучэбным планам для студэнтаў, тэрмін атрымання адукацыі якіх складае 5 гадоў, на вывучэнне дысцыпліны «Піратэхніка ў свяце» максімальна адведзена 74 гадзіны, з якіх 50 гадзін – аўдыторныя заняткі (30 гадзін – лекцыі, 20 гадзін – практычныя); а для студэнтаў, тэрмін атрымання адукацыі якіх складае 4 гады або 3,5 гады, – максімальна прадугледжана 68 гадзін, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі (12 гадзін – лекцыі, 18 гадзін – практычныя, 4 гадзіны – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў па дадзенай дысцыпліне – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

(для студэнтаў, тэрмін атрымання адукацыі якіх складае 5 гадоў)

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| *Тэма 1.* Гісторыя развіцця феерверкаў у Беларусі | 4 | 4 | |
| *Тэма 2.* Сучасныя беларускія феерверкі і святлогукапіратэхнічныя дзеі | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 3.* Арганізацыя святочнага феерверку | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Асноўныя звесткі аб піратэхнічных вырабах | 4 | 4 | |
| *Тэма 5.* Тэхналогія вырабу і мантаж піратэхнічных фігур | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 6.* Методыка стварэння сцэнарыя пірадзеі, яе матэрыяльна-тэхнічнае і фінансавае забеспячэнне | 12 | 6 | 6 |
| *Тэма 7.* Распрацоўка рэжысёрскай эксплікацыі піратэхнічнай дзеі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Распрацоўка рэжысёрскага праекта тэатралізаванага феерверку | 6 | 2 | 4 |
| Разам… | 50 | 30 | 20 |

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

(для студэнтаў, тэрмін атрымання адукацыі якіх складае 3,5 і 4 гады)

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. | індывід. заняткі |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| Гісторыя развіцця феерверкаў у Беларусі | 1 | 1 | | |
| Сучасныя беларускія феерверкі і святлогукапіратэхнічныя дзеі | 6 | 2 | 4 | |
| Арганізацыя святочнага феерверку | 4 | 2 | 2 | |
| Асноўныя звесткі аб піратэхнічных вырабах | 4 | 2 | 2 | |
| Методыка стварэння сцэнарыя пірадзеі, яе матэрыяльна-тэхнічнае і фінансавае забеспячэнне | 10 | 2 | 6 | 2 |
| Распрацоўка рэжысёрскай эксплікацыі піратэхнічнай дзеі | 8 | 2 | 4 | 2 |
| Разам… | 34 | 12 | 18 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта, задачы, роля дысцыпліны «Піратэхніка ў свяце» ў сістэме навучання студэнта. Вучэбна-метадычнае забепячэнне, сувязь з іншымі дысцыплінамі. Генезіс светлавых дзей. Этымалогія назваў «піратэхніка» і «феерверк». Структура піратэхнічных дзей Беларусі і народаў свету. Вобразнае вырашэнне феерверкаў у архітэктурна-дэкаратыўным, музычным і пластычным вырашэннях. Агульныя палажэнні фінансавання феерверкаў.

### *Тэма 1. Гісторыя развіцця феерверкаў у Беларусі*

Вогненна-светлавыя дзеі народных свят – вытокі феерверкаў. Розныя формы вогненных дзей рэлігійнага і свецкага характару ў народаў Еўропы, Азіі і Афрыкі.

Этымалогія назваў «феерверк», «піратэхніка».

Феерверачны тэатр сярэдневяковай Еўропы. Творчая дзейнасць першага беларускага феерверкера – генерал-лейтэнанта кароннай артылерыі Рэчы Паспалітай Казіміра Семяновіча. Феерверачныя дзеі на рыцарскіх турнірах і тэатралізаваных шэсцях.

Феерверачныя спектаклі Беларусі XVIII ст. у Шклове і Нясвіжы.

Феерверкі і ілюмінацыя беларускіх магнатаў на тэрыторыі Беларусі ў гонар вяселляў, дзён нараджэння, пасяджэнняў сеймаў.

Піратэхнічныя дзеі XIX – пачатку XX ст. на святах, якія наладжвалі прыватныя асобы і ўстановы.

Стварэнне піратэхнічных груп у абласных цэнтрах Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Аднаўленне піратэхнічных дзей на тэатралізаваных прадстаўленнях, народных гуляннях і карнавальных шэсцях у 30–40-я гг. XX ст. (Віцебск, Мінск, Гомель). Салюты ў час Вялікай Айчыннай вайны.

### *Тэма 2. Сучасныя беларускія феерверкі і святлогукапіратэхнічныя дзеі*

Дзейнасць кафедры рэжысуры свят Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па адраджэнні беларускіх традыцый тэатралізацыі піратэхнічных дзей у 70–80-я гг. XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура і вобразнае вырашэнне водна-піратэхнічных комплексаў, створаных на святах гарадоў (Бабруйск, Воранава, Міёры).

Музычна-паэтычнае афармленне феерверкаў карнавальнага тыпу. Змест, вобразнасць і выразныя сродкі першага ў Беларусі гукапіратэхнічнага спектакля «Памяць сэрца» на мемарыяльным комплексе «Прарыў» (Ушачы, 1984) і святлогукапіратэхнічнага прадстаўлення «Дарога ў бессмяротнасць» (Быхаў, 1995).

Дзейнасць першай у пасляваенныя гады беларускай піратэхнічнай майстэрні (Баранавічы, піратэхнік Я. Бова).

Станаўленне новых форм святлодынамічных прадстаўленняў, пабудаваных на аснове беларускіх «вогненных дзей» XVII і XVIII стст. (феерверачныя прадстаўленні «Калядныя зоркі», Мінск, 1994–1995, і «Агні спадчыны», Паставы, 1995–1998).

Дзейнасць піратэхнічных майстэрань Полацка, Баранавіч, вытворча-камерцыйнай фірмы «Кальвін» Дзяржынска і таварыства з абмежаванай адказнасцю «Спецэфект» Мінска па адраджэнні і развіцці мастацкага вопыту мінулых пакаленняў, стварэнні новых відовішчаў беларускага тэатра феерверкаў. Стварэнне і творчыя работы Міжнароднага саюза развіцця піратэхнічнага мастацтва «Спецэфект-плюс».

### *Тэма 3. Арганізацыя святочнага феерверку*

*Піратэхнічная дзея як выразны сродак свята. Тэхналогія арганізацыі феерверку:* заключэнне пагаднення аб правядзенні дзеі; вызначэнне месца правядзення феерверку; распрацоўка эскізаў і выраб канструкцый піратэхнічных фігур; выраб або дагавор аб пастаноўцы пускавых піратэхнічных установак; матэрыяльна-вытворчае забеспячэнне феерверкаў; распрацоўка і падрыхтоўка фанаграмы піратэхнічнага прадстаўлення; вырашэнне пытання ўзмацнення агнявой дзеі; пошук сухога памяшкання для захавання піратэхнічных вырабаў і мантажу піратэхнічных фігур; дастаўка піратэхнічных вырабаў і піратэхнікаў на свята; заказ месцаў у гасцініцах для піратэхнікаў; вызначэнне рабочай групы для правядзення падрыхтоўчых работ па арганізацыі феерверку.

*Арганізацыйныя аспекты правядзення піратэхнічнай дзеі:* ахова месца правядзення феерверку; забеспячэнне рацыямі галоўнага рэжысёра, піратэхнікаў, прадстаўнікоў міліцыі, пажар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най і медыцынскай службаў; арганізацыя баявога дзяжурства нарада пажарнай аховы каля месца правядзення феерверку; арганізацыя дзяжурства работнікаў хуткай дапамогі каля рэжысёрскага пункта.

*Завяршальны этап арганізацыі феерверку:* ахова піратэхнічнага поля і забарона допуску гледачоў да канца дэмантажу пускавых установак; работа рабочай групы па размініраванні і эвакуацыі піратэхнічных фігур і пускавых установак; зняцце з дзяжурства нарадаў міліцыі, пажарнай аховы і медыцынскай службы пасля эвакуацыі піратэхнічнага абсталявання.

### *Тэма 4. Асноўныя звесткі аб піратэхнічных вырабах*

Піратэхніка – навука аб якасцях піратэхнічных (вогненных) рэчываў і спосабах іх вырабу.

Класіфікацыйныя групы вырабаў:

1) наземныя, вадзяныя феерверачныя вырабы (ніжні ўзровень), якія пасля запуску застаюцца на зямлі (вадзе), – фантан, форс, кітайскае кола, контурная свечка, фальшвеер, ліставая зорка, бенгальская свечка, шпага, марсавы агонь, успышка, дукер, квакар;

2) сярэднія, або паркавыя, феерверачныя вырабы (сярэдні ўзровень), якія пасля запуску застаюцца на зямлі, але выкідаюць уверх размешчаныя ў іх піраэлементы, – рымская свечка, бурак, фугас;

3) вышынныя феерверачныя вырабы (верхні ўзровень), якія пасля запуску цалкам падымаюцца ўверх і там спрацоўваюць, – ракета, камета, жаваранак;

4) дробныя феерверачныя вырабы, прызначаныя для начынення буйных вырабаў, – швермер, пчолка (піраэлементы – зоркі, вогненны дождж);

5) група дапаможных шравырабаў, якія выкарыстоўваюцца для перадачы вогненнага імпульсу да феерверачных вырабаў і іх частак – стапін, вогнеправодны шнур, палільная свечка, электразапальнік.

Апісанне тыповых феерверачных вырабаў асноўных груп. Спосаб адстрэлу і характар дзеяння вырабаў.

Меры перасцярогі пры рабоце з феерверачнымі вырабамі. Дапамога пры атручванні хімікатамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Тэхналогія вырабу і мантаж піратэхнічных фігур*

Тэхналогія вырабу дымавых феерверачных вырабаў. Выраб і спецыфіка падрыхтоўкі да дэманстрацыі наземных і вадзяных феерверачных вырабаў (фантан, форс, контурная свечка, фальшвеер, успышка, дукер, квакар). Выраб сярэдніх феерверачных вырабаў (рымская свечка, бурак, фугас). Выраб вышынных феерверачных вырабаў (ракета, камета, жаваранак).

Мантаж статычных і дынамічных піратэхнічных фігур дэкаратыўнага феерверку (кветкі, дрэвы, сонца, махавое кола, вертыкальны і кругавы вогнеспад, надпісы, лічбы і інш.). Мантаж піратэхнічных фігур у адзіную мастацкую кампазіцыю. Спосабы мантажу піратэхнічных канструкцый («дракон», «Бахус», «карабель», «елкі» і інш.).

Меры перасцярогі пры рабоце з феерверачнымі вырабамі. Дапамога пры атручванні хімікатамі.

### *Тэма 6. Методыка стварэння сцэнарыя пірадзеі, яе матэрыяльна-тэхнічнае і фінансавае забеспячэнне*

Вызначэнне ўрачыстай падзеі грамадскага або прыватнага характару, у гонар якой наладжваецца феерверк, а таксама яго тэмы і ідэі. Стварэнне агульнага сцэнарнага плана (праграмы) феерверку.

Распрацоўка эпізодаў, якія адлюстроўваюць адзначаемую падзею, сцэнарна-рэжысёрскага ходу, што аб'ядноўвае разрозненыя часткі сцэнарыя ў адзінае драматургічнае цэлае.

Распрацоўка мастацка-вобразнага вырашэння феерверкаў у дэкаратыўным, музычным і славесным увасабленні.

Стварэнне паэтычнага і празаічнага матэрыялу драматургічных сцэнак феерверку.

Распрацоўка планіровачнага вырашэння феерверку, эскізаў дэкарацый, карцін, вобразна-сімвалічных фігур, структурных піратэхнічных вырабаў і кампанентаў.

Напісанне літаратурнага сцэнарыя феерверку.

Выкладчык на занятках ажыццяўляе прагляд і аналіз зробленай работы, робіць прапановы па яе ўдасканаленні.

### *Тэма 7. Распрацоўка рэжысёрскай эксплікацыі піратэхнічнай дзеі*

Студэнт задумвае і распрацоўвае асобныя пірадзеі, якія могуць быць выкарыстаны ў яго дыпломным свяце, або сцэнарый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і пастановачны план феерверку як заключнай часткі асобнага святочнага мерапрыемства ці ўсяго свята. У рэжысёрскую распрацоўку ўваходзіць: абгрунтаванне выбару дзеі, ідэйна-тэматычны аналіз, праграма (структура) дзеі, кампазіцыйная пабудова (завязка, кульмінацыя, фінал), сцэнарна-рэжысёрскі ход, рэжысёрскія эпізоды, прасторавае вырашэнне піратэхнічнай дзеі, вобразная сімволіка піратэхнічных фігур, колеравая гама, музычная структура, пластычныя дзеі (пры неабходнасці), выбар творчых калектываў і выканаўцаў асобных драматычных дзей, сцэнак, пластыка-харэаграфічных сцэн. Распрацоўка парадку спальвання феерверку. Выбар месца для гледачоў у залежнасці ад ландшафту і архітэктурных асаблівасцей месца дзеяння.

Выкарыстанне для ўзмацнення відовішчнасці феерверку (пры мантажы фігур) архітэктурных пабудоў, сцэн, скульптур, электраасвятлення, інжынерных канструкцый, акваторыі і інш.

Выкладчык на занятках ажыццяўляе прагляд і аналіз зробленай работы, робіць прапановы па яе ўдасканаленні.

### *Тэма 8. Распрацоўка рэжысёрскага праекта тэатралізаванага феерверку*

Студэнт складае арганізацыйна-вытворчы план піратэхнічнай дзеі: запіс фанаграм або падрыхтоўка музычнага калектыву, які будзе суправаджаць феерверк; падрыхтоўка пластычнага дзеяння (калі існуе неабходнасць); выраб дэкарацый, піратэхнічных фігур, элементаў і саставаў; падрыхтоўка светлавога абсталявання – пражэктары, праекцыйная і лазерная апаратура (калі існуе неабходнасць); месца захавання і аховы феерверачных вырабаў; падрыхтоўка грузавога транспарту і суправаджаючых для дастаўкі феерверачных вырабаў; падрыхтоўка брыгады рабочых для здзяйснення пагрузачна-разгрузачных работ і размяшчэння піратэхнічных фігур і ракетных павільёнаў; забеспячэнне аховы месца правядзення феерверку, мер супрацьпажарнай бяспекі, медыцынскага абслугоўвання (на выпадак няшчасных здарэнняў); вырашэнне пытання харчавання і размяшчэння піратэхнікаў-дэманстратараў і членаў пастановачнай групы; забеспячэнне перагаворнымі сродкамі рэжысёра, піратэхнікаў, супрацоўнікаў аховы парадку, пажарнай і медыцынскай службаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым студэнт здзяйсняе вытворчы аналіз сцэнарыя, на аснове якога распрацоўвае тэхналогію падрыхтоўкі феерверку (віды работ па вырабе піратэхнічных фігур, мастацкіх кампазіцый, дэкарацый); вызначае віды і колькасць матэрыялаў, неабходных для вырабу пірафігур; складае каштарыс феерверку (кошт вырабу піратэхнічных фігур, аплата работы пастановачнай групы і піратэхнікаў-дэманстратараў, камандзіровачныя выдаткі); дакументацыю па падрыхтоўцы і дэманстрацыі феерверку, а таксама вызначае супрацьпажарныя меры і правілы арганізацыі піратэхнічнай дзеі – бяспечную адлегласць месца правядзення феерверку ад гледачоў, будынкаў, лесу; разлічвае «ружу вятроў» пры арганізацыі салюту, выбухаў сігнальных мін, стрэлаў з ракетніц; здзяйсняе ўстаноўку піратэхнічных сродкаў па вертыкальнай лініі; плануе напрамак паветранай дзеі з улікам надвор'я; забяспечвае наяўнасць баявога паста службы аховы парадку, медыцынскай службы і пажарнай машыны (у перыяд здзяйснення феерверку) каля месца мантажу піратэхнічнага поля.

Выкладчык на індывідуальных занятках разам са студэнтамі разглядае ўсе віды работ і дае канкрэтныя рэкамендацыі па іх выкананні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII в. / Г. И. Барышев. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 96–98.
2. *Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджык Бук, 2007. – С. 4–96.
3. *Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – С. 64–71.

*Дадатковая*

1. *Гуд, П. А.* Огненная симфония. Из истории фейерверков Белоруссии / П. А. Гуд. – Дзержинск : Юніпак, 1997. – С. 3–18.
2. *Гуд, П. А.* Беларускае Купалле : кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : БДУ культуры, 1999. – С. 91–92, 111–112.
3. *Крылов, О. А.* Основы фейерверочного искусства / О. А. Крылов. – М. : Газ. «Моск. правда», 1996. – С. 29–58.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПІРАТЭХНІКА Ў СВЯЦЕ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,48. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ